# Адкрывальнік беларускіх цудаў

*Заканчэнне. Пачатак у № 8 за 2012 год.*



Анатоль БУТЭВІЧ, пісьменнік

**– Вернемся да гісторыі ў Вашай творчасці... Кожны пісьменнік бярэцца за тэму асвятлення мінулага па-свойму – хтосьці рамантызуе, іншыя пішуць дакументальную прозу. Які метад абралі Вы? Што для Вас галоўнае, калі дакранаецеся да мінуўшчыны?**

– Перш за ўсё хачу сказаць, што вырашыў займацца гісторыяй, калі сабралася крытычная маса неабходнага матэрыялу і адпаведнага настрою. У мяне дома вялікі архіў гістарычных матэрыялаў, якія да гэтага часу не ўсе скарыстаны. Яшчэ будучы студэнтам меў доступ і ў Ленінку, а не ўсім студэнтам давалі туды чытацкі білет, і ў партархіў, куды студэнтаў наогул не пускалі, але паколькі я пісаў для БелСЭ, то дазвол далі.

Аднак прынцыповым пры абранні накірунку творчасці стала знаходжанне на пасадзе першага пасла Беларусі ў Румыніі. Калі сустракаліся з калегамі-дыпламатамі, то яны пыталіся: а што такое Беларусь? Калі расказваў, напрыклад, пра Дамейку ці Касцюшку, то мне гаварылі: якія адносіны да Беларусі мае нацыянальны герой Чылі альбо Амерыкі? І я зразумеў: каб іншыя маглі ведаць пра нашу Беларусь, нам трэба самім добра ведаць сваю краіну, не саромецца яе гісторыі.

Па вяртанні з Румыніі даведаўся, што выдавецтва «Кавалер Паблішэрс» пачало серыю кніг «Сем цудаў Беларусі». Першую выдаў Уладзімір Ягоўдзік. Мне выдавецтва прапанавала працягваць, і я адразу адмаўляўся. Бо гэта вельмі цяжкая праца! Каб напісаць кароценькае эсэ, трэба перакапаць масу літаратуры і дакументаў. А я прыхільнік прынцыпу: калі пішаш пра гісторыю, то ўсё павінна быць на аснове дакументаў, дакладна. Аднекваўся, але потым узяўся. І захварэў на гісторыю, захварэў невылечна. У серыю ўвайшла толькі невялічкая частка сабранага матэрыялу.

Галоўнае для мяне, калі дакранаюся да мінуўшчыны, зразумець: што тады адбывалася і чаму, якія наследкі былі для нашых зямель. А яшчэ – гісторыя гэта ж не толькі войны і змаганні. Гэта і простае жыццё людзей. Якім яно было, што пераважала, што кіравала ўчынкамі? Хіба ж гэта не цікава? Таму я за строга дакументальны пачатак, што ніяк не выключае і названай Вамі рамантызацыі.

Тут я хацеў бы спыніцца на падручніках гісторыі. Быў такі перыяд, калі яны пісаліся вельмі суха і нецікава. Я казаў тады, што патрэбна легендызаваць гісторыю так, як рабіў гэта Уладзімір Караткевіч. Паглядзіце, ён ужо ўспрымаецца як гісторык-настаўнік, але ж яго творы мастацкія, там ёсць і домысел, і рэальныя факты. Я перакананы: у аснове павінны ляжаць факты, а да іх ужо можа дадавацца аўтарская інтэрпрэтацыя.

...Калі гаварыць пра мае гістарычныя творы, то мяне цікавіла пэўная навізна, незамыленасць погляду на гісторыю Беларусі, дэталькі, як я іх называю. Напрыклад, часта на сустрэчах задаю пытанне: быў у Расіі Пётр

## НАША ДАСЬЕ

БУТЭВІЧ Анатоль Іванавіч.

Нарадзіўся ў 1948 годзе на хутары Язавец Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. У 1971 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Працаваў у БелТА (1971–1973), ЦК ЛКСМБ (1973–1975, 1980), намеснікам рэдактара газеты «Чырвоная змена» (1975–1980), інструктарам, загадчыкам сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры, намеснікам загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ (1980–1986, 1987–1990), дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1986–1987). У 1990–1992 гадах – старшыня Дзяржаўнага камітэта па друку, у 1992–1994 – міністр інфармацыі, у 1994–1996 гадах – міністр культуры і друку. З 1996 года генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Гданьску, у 1998–2000 гадах – пасол Рэспублікі Беларусь у Румыніі.
Намеснік старшыні Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, старшыня грамадскай назіральнай камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры, член Беларускай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, намеснік старшыні Беларускага фонду культуры.
Аўтар кніг аповесцяў і апавяданняў, казак для дзяцей, гістарычных апавяданняў з серыі «Сем цудаў Беларусі», рыцарскай аповесці «Каралева не здраджвала каралю...» і інш. Перакладчк з польскай, рускай, украінскай моў.
Сфера інтарэсаў: гісторыя Беларусі ад даўніх часоў, краязнаўства, матэрыяльныя сведчанні даўняга жыцця, кнігі.

Вялікі, у Францыі Карл Вялікі, іх усе ведаюць, а хто ў беларускай гісторыі «Вялікі»? Вельмі рэдка хто падыме руку і назаве Вітаўта.

**– Прабачце, але пры жыцці яго так не называлі. На Русі да Вітаўта вельмі складана ставіліся.**

– Паглядзіце паэму Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра»...

**– Дык гэта 1523 год, а Вітаўт памёр у 1430.**

– Але аўтар спасылаецца на меркаванні сучаснікаў Вітаўта. У любым выпадку, гэта дэталька, якіх па нашай гісторыі раскідана вельмі шмат. На адной з сустрэч з навучэнцамі каледжа электронікі мне задалі пытанне, як я разумею нацыянальную ідэю. Не быў гатовы і адказаў экспромтам. Чым не нацыянальная ідэя ў словах паўстанцаў Кастуся Каліноўскага: «Каго любіш? – Люблю Беларусь. – То ўзаемна». Вы мне запярэчыце, што гэта легенда і такога не было. Існуе і такое меркаванне. Але нават калі гэта легенда, то хай сабе жыве. Настаўніца мне потым расказвала, што хлопцы, дарэчы, пасля 10 класа, яшчэ паўгода раніцай віталіся гэтымі словамі.



А. Бутэвіч і М. Танк. 1990 год

Чарговы раз я пераканаўся: калі мы хочам, каб нас ведалі і разумелі, паважалі і шанавалі, трэба спачатку самім сябе ведаць, шанаваць і паважаць, ведаць сваю гісторыю такой, якой яна была – не падтасоўваць, не выкідваць, не дадаваць.

**– І ўсё ж у Вашых словах, на маю думку, ёсць супярэчнасць. З аднаго боку, Вы кажаце, што гісторыя – гэта факт. З другога – трэба часткова легендызаваць гісторыю.**

– Вы няправільна зразумелі. Не падмяняць факты легендамі. Я за тое, каб не выкідваць з гісторыі, асабліва для школьнікаў, легенды, якія існуюць літаральна пра кожную падзею, горад, многіх гістарычных асоб. Не выдумляць спецыяльна, а ведаць тыя паданні і паказкі, якія існавалі ў народзе.

**– Ці не атрымаецца так, што хутка мы не зможам адрозніць факт ад легенды альбо падання?**

– Не. Легенды жывуць сваім жыццём. Паглядзіце тыя ж паданні пра заснаванне Вільні ці паходжанне роду Радзівілаў. Хіба можна не ведаць гэтых легенд? Дык чаму ж яны не маюць права быць у гісторыі?

**– Як Вы вызначаеце, хто наш герой, а хто не? Напрыклад, Вітаўт – літовец, нарадзіўся ў язычніцкай сям'і. А ў Беларусі ўжо стагоддзямі існавала высокая хрысціянская культура. І Вітаўт атрымліваецца чужым для Беларусі. А якая дзяржава тады ў нас была? Вялікае Княства Літоўскае. А хто кіраваў гэтай дзяржавай? Гедымін, Альгерд, Ягайла, Вітаўт. Тады атрымліваецца, што і Кацярына II, і Аляксандр I таксама нашы ўладары, бо мы тады ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі, і іншай дзяржавы ў беларусаў не было.**

– У пэўным сэнсе так. Калі глядзець па кіраўнічаму статусу. Але гэта не мой погляд. І потым, калі мы распавядаем пра нейкага дзяржаўнага дзеяча ці дзеяча культуры мінулага, мы ж не вызначаем, што ён беларус, а кажам, што ён наш зямляк. Напрыклад, тыя ж Ігнат Дамейка ці Эліза Ажэшка. Мы ж не гаворым пра Міцкевіча, што ён быў беларускім паэтам. На мой погляд, іх трэба вызначаць як дзеячаў, сваім паходжаннем звязаных з беларускай зямлёй. І ўшаноўваць адпаведным чынам. Як будзе зроблена гэта, напрыклад, з сядзібай Дастаеўскіх у вёсцы Дастоева Іванаўскага раёна, адкуль выйшаў род знанага рускага пісьменніка.

Дарэчы, Лаўрэнцій Абэцэдарскі ў свой час напісаў кніжку «Беларусы ў Маскве», там ён налічыў дзесьці 500 даволі вядомых асоб, паходжаннем звязаных з Беларуссю. Ён жа сцвярджае, што сярод жыхароў расійскай сталіцы ў апошняй трэці XVII стагоддзя беларусы складалі 20 працэнтаў. Вазьміце таго ж Сімяона Полацкага. І потым такая традыцыя працягвалася. Напрыклад, маўзалей Леніна будавалі нашы майстры з вёскі Грабаўка, што на Гомельшчыне. Школьнікам я перапісваўся з некаторымі.

Я лічу, што мы, беларусы, нацыя донараў, мы аддалі многіх славутых людзей іншым нацыям і краінам. Гэта не азначае, што зараз трэба сказаць, каб нам іх аддалі. Ніякага перадзелу тут быць не можа. Іншая справа, што ўсе павінны ведаць, адкуль паходзяць

гэтыя людзі, дзе іх карані. Тым самым народы, далёкія ад нас, даведаюцца, што ёсць Беларусь. Краіна Беларусь, а не ўскраіна Польшчы ці Расіі.

Тое ж самае датычыцца і сярэдневякоўя. Прынята неяк дэманізаваць асобу Ягайлы, падаваць яго як здрадніка. Маўляў, здрадзіў праваслаўю, аддаў ВКЛ Польшчы, прыцясняў Вітаўта і г.д. Але давайце паглядзім на тыя падзеі вачыма сучаснікаў. Вітаўт быў патрыётам, любіў сваю зямлю, дбаў пра яе дабрабыт. Але і ён ставіў касцёлы, як і Ягайла. Чаму некаторыя намагаюцца зрабіць героем толькі Вітаўта, а Ягайлу выключна здраднікам? На гісторыю трэба глядзець сённяшнімі вачыма, але не заплюшчваючы іх. Кан'юнктуршчыкам гісторыя не даруе.

**– Калі паглядзець на гісторыю, то Вітаўт і Ягайла былі, так бы мовіць, заклятыя сябры.**

– Можа быць і так. Але пры Ягайлу ніколі ВКЛ не было інкарпаравана ў Каралеўства Польскае. Хоць пасля Крэўскай уніі 1385 года было заключана не адно пагадненне на гэты конт, ВКЛ існавала. Толькі Люблінская унія, супраць якой, дарэчы, выступалі Радзівілы і іншыя магнаты ВКЛ, зрабіла яго канфедэратыўнай дзяржавай. Альбо рэлігійныя матывы. Ці здрадзіў Ягайла праваслаўю ў поўным сэнсе слова, як яму гэта прыпісваюць? У маім разуменні – не. У польскім Любліне, дзе Ягайлу абралі каралём польскім, існуе капліца, распісаная пры Ягайлу русінскімі (некаторыя даследчыкі даводзяць, што беларускімі, я не аспрэчваю гэтую гіпотэзу) майстрамі ў праваслаўным стылі. І не толькі яна. У Кракаўскай спальні Ягайлы на Вавелі таксама віселі праваслаўныя абразы.

**– Але пры ім праваслаўных абмяжавалі ў грамадзянскіх і палітычных правах, прыціскалі.**

– Было і гэта. Аднак на гісторыю трэба глядзець як на гісторыю, а не на займальнае чытво для задавальнення вось зараз узніклых інтарэсаў. Акрамя таго, што я казаў, дадам, што Соф'я Гальшанская пахавана ў праваслаўнай капліцы, пабудаванай у Вавельскім кафедральным касцёле ёй самой пры жыцці Ягайлы. Іхні сын Казімір таксама знайшоў там спачын, і таксама месца пахавання пазначана праваслаўнымі адметнасцямі. Дык што, Ягайла пра гэта не ведаў? Ці мо Соф'я зрабіла насуперак яму?

**– Добра. Але ўсё ж цяжка спрачацца з тым, што менавіта Ягайла паклаў пачатак паланізацыі ВКЛ. А наступствы былі катастрафічныя. Ужо ў XVIII стагоддзі арыстакратыя была поўнасцю спаланізавана.**

– Так, паклаў. Але тут спрэчнае пытанне. Трэба ж бачыць і тыя, менавіта тыя абставіны, у якіх мусіў дзейнічаць Ягайла як палітык і як дзяржаўнік. Мусіў рабіць не заўсёды тое, што хацелася самому, мусіў пераадольваць супраціўленне польскіх магнатаў. Мо часам стамляўся ад гэтага, адступаўся. Згадайма ролю ў Ягайлавым жыцці ягонага сакратара і кракаўскага біскупа Збігнева Алясніцкага, які, дарэчы, перашкодзіў каранацыі Вітаўта на караля літоўскага. Зрэшты, многія Радзівілы таксама беларусамі сябе лічылі альбо грамадзянамі ВКЛ, заяўлялі пра гэта.



Аўтограф рускага пісьменніка В. Бялова. 1990 год

**– Дзе і калі?**

– Магдалена Радзівіл – пачытайце.

**– Дык гэта ўжо пры канцы існавання Расійскай імперыі. Тым больш што Радзівіл яна стала пасля шлюбу, а ўроджана была як Завіша-Кежгайла.**

– Але ж яна далучылася да роду Радзівілаў. Яна і грошы давала на развіццё беларускай культуры, і школы беларускія ў сваіх уладаннях ладзіла. Сумняваюся, што была суцэльная паланізацыя магнатаў і шляхты ў XVIII стагоддзі. Вернемся да Ягайлы. Ён жа быў палітыкам, дзейнічаў у пэўным асяроддзі, у кантэксце агульнаеўрапейскай гісторыі. Гістарычны дзеяч не можа быць добрым ці кепскім па ўсіх пазіцыях. Так я гляджу на гэтыя падзеі ў сваім рамане «Каралева не здраджвала каралю, або Каралеўскае шлюбаванне ў Навагародку», прысвечаным Ягайлу і яго чатыром жонкам.

**– Вы можаце назваць для сябе з усёй гісторыі Беларусі дзесяць найбольш значных герояў?**

– Мо не герояў, але значных дзеячаў нашай мінуўшчыны, якія тым ці іншым чынам паўплывалі на ход гісторыі, на станаўленне беларускага характару. Гэта і стваральнік ВКЛ і першы і адзіны вялікалітоўскі кароль Міндоўг, і наша святая заступніца зямлі беларускай Еўфрасіння Полацкая, і Францыск Скарына, і Вітаўт Вялікі, і Ягайла, і Кастусь Каліноўскі, і Янка Купала, і Максім Багдановіч, і Пётр Машэраў, і Васіль Быкаў. Можна дадаць і іншыя постаці, якія застануцца ў гісторыі, незалежна ад розных версій пра іхнюю дзейнасць.

**– Дык а што Вітаўт зрабіў такога добрага для Беларусі?**

– А што зрабіў дрэннага? Ён ствараў дзяржаву. Беларусі тады, выбачайце, яшчэ не было. Як не было яе пры Еўфрасінні Полацкай, падчас нараджэння Купалы, Коласа... Сёння мы кажам, што Максім Багдановіч усё сваё жыццё спяваў пра Беларусь, але ж ён ніводнага дня ў Беларусі не жыў. У дзяржаве Беларусь.

Дарэчы, мой твор пра Вітаўта яшчэ наперадзе. Ёсць такая задумка, матэрыялаў назапашана шмат. Такія творы патрэбны. У тым ліку для турыстаў. Мы кажам, што хочам развіваць турызм. Але чым турыста прывабіць? Тым, чаго няма ў яго дома. Праўда, у нас таксама многага для турыстаў няма. Няма дастатковай колькасці самай разнастайнай – ад тонкіх брашур да шыкоўных альбомаў – кніжнай прадукцыі на розныя чытацкія густы і на розны ўзрост чытача пра найбольш значныя гістарычныя і культурныя помнікі, няма вялікай разнастайнасці сувеніраў гэтай жа тэматыкі. Даўно нідзе нельга купіць значок, плакетку, медаль, бюст ці што-небудзь іншае з выявай Багдановіча, Купалы, Коласа, Караткевіча, Быкава, Сапегі, Каліноўскага – спіс можа атрымацца бясконцым. І няпраўда, што гэта незапатрабвана. На свае вочы бачыў, як разбіраюць у Кракаве фігуркі Ягайлы, Соф'і, іншых герояў нашай агульнай гісторыі.

Чаму мы не ствараем брэнды нашым знакавым гарадам, звязаным з гістарычнымі падзеямі? Гэта ж на паверхні! Навагрудак – не толькі радзіма Міцкевіча, але і першая сталіца ВКЛ. Гродна – каралеўскі горад, дзе праводзіліся соймы, была рэзідэнцыя польскіх каралёў, дзе захаваліся іхнія замкі. Магілёў – месца, дзе знаходзілася апошняя



З пісьменнікам А. Кудраўцом (справа) у бацькоў Івана Іванавіча і Марыі Канстанцінаўны Бутэвічаў. Вёска Баяры Нясвіжскага раёна, 1999 год

Стаўка апошняга расійскага цара Мікалая II у час Першай сусветнай вайны. Мір – горад не толькі сусветна вядомага замка, але і цыганская сталіца на ўсё Вялікае Княства Літоўскае...

Калі вяртацца да нашых магнатаў, то можна па-іншаму паглядзець і на Радзівілаў. Іх уладанні ўяўлялі сабой дзяржаву ў дзяржаве. Я пра гэта пішу ў сваёй новай кніжцы пра Нясвіжскі замак. У Радзівілаў былі ўсе прыкметы дзяржаўнасці. Яны мелі нават сваё ўласнае войска, суд, архіў.

**– І чым тут ганарыцца? Гэта ж развальвала дзяржаву, тую ж Рэч Паспалітую і ВКЛ.**

– Не магу пагадзіцца.

**– Як? Гэта ж прыкметы феадальнай падзеленасці, якую Расія і большая частка астатняй Еўропы пераадолелі яшчэ ў XIV–XVI стагоддзях.**

– Калі з гэтых пазіцый разглядаць, то можна многае з нашай гісторыі наогул выкрасліць альбо надаць яму негатыўны характар. А гэта ўжо эмоцыі, а не праўдзівая праўда. Згадайма, колькі Радзівілаў было на самых высокіх пасадах у ВКЛ і Польшчы – ад канцлераў, гетманаў да ваяводаў віленскіх. Дык яны што, ішлі туды, каб развальваць гэтыя дзяржавы?! А колькі з іх стала выдатнымі военачальнікамі, якія не за свае асабістыя інтарэсы змагаліся? Многія грошай сваіх і багаццяў уласных не шкадавалі для добрых і карысных спраў не адно Нясвіжа, а і ўсёй нашай зямлі. Успомніце, колькі сярод Радзівілаў было мецэнатаў. І для статыстыкі, якая ўсё ведае і не церпіць

эмоцый: у валоданні Радзівілаў знаходзіліся 23 замкі, 426 гарадоў і мястэчак, 2032 маёнткі, 10 053 вёскі. Сярод прадстаўнікоў роду былі кардынал, каралева, тры епіскапы, 37 ваяводаў, 22 канцлеры, гетманы і нямала іншага пасаднага люду. Яны адначасова валодалі маёнткамі ў Аўстрыі, Польшчы, Прусіі, Італіі, Францыі, на Украіне – усяго на землях дзевяці цяперашніх еўрапейскіх дзяржаў.

Такая вось радзівілаўская дзяржава...

**– Калі ВКЛ – гэта наша беларуская дзяржава, дык хіба пазітыўна тое, што пэўны магнацкі род ствараў у яе межах сваю псеўдадзяржаву, дзе не выконваліся агульныя законы? У выніку такія роды, як Радзівілы, прывялі да заняпаду і ВКЛ, і Рэчы Паспалітай.**

– Выбачайце, калі Радзівілы прывялі да заняпаду і спрыялі невыкананню агульных законаў?.. Я не бачу такіх бясспрэчных фактаў. Куды горш, што паміж трыма дзяржавамі падзялілі ўсе землі былой Рэчы Паспалітай абодвух народаў, у тым ліку і ВКЛ. Знікла магчымасць беларусам мець сваю дзяржаву. Таму і на род Радзівілаў цяпер пачынаем наракаць...

**– Добра, давайце адыдзем ад персон, а падыдзем да збудаванняў, тым больш што Ваш літаратурны праект тычыцца і замкаў. Што такога адметнага ў дзяржаўнай праграме «Замкі Беларусі»? Будзем адбудоўваць нанава?**

– Па-першае, некарэктная пастаноўка пытання «адбудоўваць». Калі Вы пазнаёміцеся з праграмай, то там гэта слова не ўжываецца. 38 замкаў, якія ўключаны ў праграму, у залежнасці ад свайго стану будуць ці рэстаўрыравацца, ці ставіцца на кансервацыю, альбо проста будзе ўпарадкавана тэрыторыя. Па-другое, ёсць замкі, ад якіх засталіся толькі пагоркі – замчышчы.

Ну як адбудаваць сёння Крэва ці Гальшаны?! Не засталося ні планаў, ні схем, як выглядалі гэтыя замкі. Зрэшты, Гальшаны ў такім выглядзе, як сёння, закансерваваныя, будуць больш прыцягальнымі, чым адбудаваны замак. Цікавая справа з Навагрудкам. Як старшыня Грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, я падтрымаў прапанову міністра культуры Паўла Латушкі пра збор грамадскіх сродкаў на гэты аб'ект. Замак будзе ачышчаны ад смецця, бо пасля вайны ўсё, што было разбурана, вывозілі і высыпалі на замчышчы. Як сведчаць археолагі, на яго тэрыторыі насыпана каля 3 метраў друзу. Уявіце, калі здымуцца гэтыя метры, то адкрыюцца і муры. Потым умацуюць вежы, у адной з іх зробяць мінімузей, дзе будуць рэчы, знойдзеныя падчас раскопак.

І так з кожным з 38 замкаў, бо ў кожнага свая гісторыя. Той жа Любчанскі замак з самага пачатку рэстаўрыруецца за прыватныя грошы і з намаганняў асабіста Івана Пячынскага. Там працуюць кожны год валанцёры з ліку не толькі беларускай моладзі. Тут вельмі важны і выхаваўчы момант.

Таксама і са зборам сродкаў на Навагрудскі замак. Калі кожны з нас, беларусаў, зразумее важнасць гэтай справы і дасць хоць адну капейку на замак, то гэта зменіць не толькі стан гістарычнага помніка, але і нас саміх, стан нацыі. Тут дарэчы згадаць грамадскі збор сродкаў (між іншым, і не без майго ўдзелу) на замену так званай гадзіннікавай вежы Нясвіжскага замка. Знайшліся добрыя людзі, бізнесмены ў тым ліку, і зрабілі карысную справу. Больш бы такіх ініцыятыў. А то вельмі часта мы забываемся пра нашы гістарычныя помнікі. Мы не толькі не хочам прызнаць іх заслужанымі пенсіянерамі, мы іх бамжамі робім. Як толькі з помніка выехалі дзіцячы садок ці школа, адразу будынак рабуецца ўшчэнт. Трэба зразумець, што гэта каштоўнасць, не намі створаная.

Дарэчы, мяне як старшыню грамадскай назіральнай камісіі і члена навукова-метадычнай рады па гэтых жа пытаннях непакоіць тэндэнцыя, якая складваецца апошнім часам з жаданнем выключыць помнікі з Дзяржаўнага спіса, дзе зараз 5555 аб'ектаў (у савецкі час было 15 тысяч, хай сабе там былі і помнікі Леніну, але ж...). Ёсць закон, які рэгулюе адносіны ў гэтай сферы, ёсць іншыя дакументы. Мы, наша камісія, змагаемся за гэтыя помнікі. Да таго ж урад бачыць неабходнасць пашырэння спісу: сваім рашэннем ён даручыў Міністэрству культуры за пяць гадоў павялічваць спіс на 1000 помнікаў.

**– Вы ўзгадалі наш айчынны спіс гісторыка-культурных помнікаў. Існуе**

**такі і на глабальным узроўні – Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. У ім пакуль чатыры беларускія аб'екты. Ці ёсць перспектыва па ўключэнні новых?**

– Ёсць. Аднак і тут сітуацыя непакоіць. Была спроба прапанаваць у спіс праспект Незалежнасці ў Мінску. Сапраўды, гэта ўнікальнае збудаванне. Бо пасля такой разбуральнай вайны стварылі праспект, што ён сам па сабе помнік кожнаму з будаўнікоў. Так, будавалі яго і палонныя немцы: што ж, разбурылі, дык і аднаўлялі. Але архітэктуру не яны дыктавалі, яна была наша – так званы «сталінскі ампір». Праспект меў права быць у спісе ЮНЕСКА. Але давайце пройдзем ад паштамта да плошчы Перамогі і паглядзім на будынкі. Што мы з імі зрабілі? Вокны, дзверы, першыя паверхі амаль усе перапрафіляваныя. Хіба гэта аўтэнтыка? І як цяпер уключаць у той спіс? У адным доме я налічыў 10 варыянтаў пластыкавых (замест драўляных) вокнаў!

Далей – рэклама ў старым горадзе. Гэта ж законам забаронена рабіць. Дзякуй богу, зараз пракуратура пачала гэтым займацца і наводзіць парадак. Давайце параўнаем Мінск з Санкт-Пецярбургам – там няма назойлівай рэкламы, няма ніводнай новабудоўлі ў гістарычным цэнтры. А паглядзіце на нашы гістарычныя вуліцы – будуецца і будуецца. І гэта ў Мінску, на вачах усіх начальнікаў. Няўжо ў нас усё толькі інвестары дыктуюць? Дык хай укладаюць грошы, але ідэя павінна быць наша, беларуская.

**– Тут паўстае і такая праблема. Тая ж Мінская ратуша, гасцініца «Еўропа» таксама не аўтэнтычныя. Гэта навабуды, «пад старыну». Ці не лепей ствараць новыя сапраўдныя помнікі архітэктуры, якімі б ганарыліся нашчадкі? Так і будзем будаваць «навадзелы»?**

– Адно другому не замінае. Патрэбны і навабуды. Але з аглядкай на асяроддзе і агульную горадабудаўнічую сітуацыю. А то, не дай бог, на месцы былога музея Вялікай Айчыннай вайны з'явіцца 38-павярховы будынак гасцініцы! Ён жа задушыць усё і ўсіх. Ці былы двухпавярховы будынак па вуліцы Рэвалюцыйнай, 24а ў Мінску. Яго павінны былі ўручную разабраць, упарадкаваць тэрыторыю, потым адбудаваць зноў. Дык «разбіралі» яго «бабай», бульдозерам. Цяпер там хочуць пабудаваць 9-павярховы гатэль са шкла і бетону.

Так што навабуд навабуду розніца. Адна справа ўзвесці будынак замест разбуранага некалі. Але ж аднавіць – пабудаваць яго такім, якім ён быў. Іншая рэч – пабудаваць замест яго сучасны, які не мае ніякага дачынення да былога. Таму добра, што аднавілі ратушу, гасцініцу «Еўропа», дзіцячую філармонію. І я быў бы рады, калі б удалося аднавіць ля Траецкага прадмесця ў Мінску дом, у якім нарадзіўся Максім Багдановіч.



Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт і А. Бутэвіч. 2005 год

Быў такі намер, да яго і я меў дачыненне, але... Добра, што хоць памятны знак-сімвал неўзабаве з'явіцца тут.

Альбо яшчэ. Я проста перакананы: нам трэба неадкладна прыняць рашэнне аб стварэнні ў Мінску скансэна – музея драўлянага дойлідства пад адкрытым небам. Пакуль не позна, пакуль у амаль што тысячагадовым горадзе не знікла апошняя драўляная пабудова: да гэтага ідзе, калі мы такімі тэмпамі будзем зносіць усё драўлянае. Яно ж нашымі продкамі збудаванае, людскімі пакаленнямі намоленае, многае мае яўныя архітэктурныя адметнасці. І калі з розумам, з развагай сабраць усё каштоўнае ў адным месцы (Паўночны завулак, які ў Дзяржаўным спісе, не падыходзіць: там мала прасторы для пераносу іншых пабудоў), то ў такім квартале, напрыклад, на беразе Чыжоўскага вадасховішча, могуць знайсці сабе занятак і дзеці, і дарослыя – адбою не будзе. Сам бачыў гэта ў цэнтры Бухарэста.

Жыве такі скансэн, людзей выхоўвае, да народных традыцый прывучае, ды і прыбытак у казну горада дае.

А для новабудоўляў у нас хапае месца і па-за цэнтрам Мінска.

Альбо наша славутая Няміга. Рака, якая дала пачатак гісторыі Мінска. Вуліца, якая мела сваю аўру, свой каларыт, сваю прыцягальную сілу. А што сёння? І Нямігай назваць сорамна. Ніякага гістарычнага падабенства ні з чым мінулым. Навошта так? З летапіснай ракой, з нашай гісторыяй, з нядаўняй Вялікай Айчыннай вайной...

Не трэба бурыць тое, што маем. Мы павінны думаць, што перададзім наступным пакаленням. Дарэчы, згодна з законам, нерухомыя аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны павінны мець праекты зон аховы. Іх маюць зараз толькі каля 2 працэнтаў помнікаў. Што можна ў такім выпадку рабіць, вы разумееце...

**– Вы працавалі ў Польшчы і Румыніі. Як там ставяцца да аховы гісторыка-культурнай спадчыны?**

– Абедзве гэтыя краіны па пытаннях аховы помнікаў маюць шмат станоўчага. У Польшчы без дазволу ахоўных органаў нельга цвік забіць у будынак, а тым больш пластыкавыя рамы паставіць. Я працаваў у Гданьску, які быў разбураны у час Другой сусветнай вайны. І палякі аднавілі ўсю «старуўку» адзін да аднаго, як было некалі.

У Румыніі сітуацыя неадназначная. У Бухарэсце помнікаў шмат, а грошай для іх рэстаўрацыі не хапае. Аднак там і не разбураюць гэтыя помнікі. Дарэчы, Нікалае Чаўшэску, рыхтуючыся да сваіх новабудоўляў, у тым ліку знакамітага велічнага будынка ЦК партыі, дзе цяпер знаходзіцца парламент, не знёс ніводнай царквы, іх толькі перасоўвалі на іншае месца. Мы прапаноўвалі так зрабіць і ў нас, напрыклад, з гістарычнай электрастанцыяй каля Белдзяржцырка, але адказалі, што грошай няма.

**– Анатоль Іванавіч, ці збіраецеся працягваць Вашу кніжную серыю?**

– Магчыма, калі знойдзецца той, хто будзе выдаваць. Калі станецца так, то зраблю кніжкі больш тэматычнымі. Да гэтага ў мяне быў такі вопыт – тэматычныя выпускі «Славутыя родам сваім» і «Перуновага племені дзеці» (пра язычніцкіх багоў). Астатнія былі больш разнапланавыя.

Прызнаюся, што серыя мела добры розгалас, шмат публікацый у прэсе. Тое, што «Народная газета» зрабіла свой праект «7 народных цудаў», потым свае «7 цудаў» выбралі Мінская вобласць, асобныя раёны – гэта якраз рэакцыя на жаданне мацаваць самапазнанне. А мо і мае кніжкі паўплывалі? Жартую. Але, што праўда, мастацкаму ўспрыняццю напісанага добра спрыяюць выдатныя ілюстрацыі сённяшняга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі мастака Паўла Татарнікава, які афармляў усю серыю. Дарэчы, на прэзентацыі гэтых кніжак часам



Сустрэча з Эльжбетай Радзівіл. Мінск, 2011 год

прыходзілі жанчыны сталага веку, якія збіралі серыю для ўнукаў, што жывуць далёка за межамі Беларусі, і прасілі падпісаць. Настальгія? Так. І гэта важны момант. Бо, паглядзіце, зараз аб'яднанні беларусаў замежжа пачынаюць шанаваць беларускую мову, традыцыі, строі, кнігі больш, чым нават мы ў Беларусі.

Прызнаюся, я доўгі час не разумеў паэтычных радкоў Алеся Ставера «Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць». Але калі папрацаваў у Польшчы і Румыніі, то сэнс іх адкрыўся зусім па-іншаму. На чужыне пачынаеш іншымі вачыма глядзець на сябе, на сваю гісторыю, усведамляеш яе як частку агульнаеўрапейскай. Узнікае пачуццё гонару за свой народ і яго мінулае.

Дай бог, каб гэткае пачуццё мацнела ў нашага маладога пакалення. Бо за маладымі – будучыня нашай дзяржавы. У тым ліку будучыня нашай гістарычнай спадчыны.

**Гутарыў Вадзім ГІГІН**